# УЗНАГАРОДА АБЛАСНОЙ ГАЗЕТЫ

Сёлета спаўняецца 15 гадоў з дня выхаду ў свет першага нумара шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт». Увесь гэты час яна з'яўлялася актыўным прапагандыстам студэнцкага будаўнічага руху. На яе старонках рэгулярна адлюстроўваліся падрыхтоўка СБА да працоўнага семестра, дасягнутыя поспехі на розных народнагаспадарчых аб'ектах. У матэрыялах расказвалася пра лепшых арганізатараў і байцоў патрыятычнага руху студэнцкай моладзі.

Напярэдадні Новага, 1984 года наша шматтыражная газета па прадстаўленню абласнога штаба СБА ўзнагароджана Ганаровай граматай абласной газеты «Гомельская праўда».

*З агульнауніверсітэцкага партыйнага сходу*

# ГРАМАДСКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ — ПАРТЫЙНЫ КЛОПАТ

Як паведамлялася ў папярэднім нумары нашай газеты, 28 снежня 1983 г. адбыўся агульнауніверсітэцкі партыйны сход. Па дакладу намесніка сакратара партыйнага камітэта ГДУ І. В. Нямкевіча абмеркавана пытанне «Аб партыйным кіраўніцтве грамадскімі арганізацыямі універсітэта».

Дакладчык адзначыў, што грамадскія арганізацыі закліканы адыгрываць надзвычай важную ролю ў далучэнні студэнтаў да грамадска-карыснай дзейнасці, у фарміраванні якасцей будучых сапраўдных арганізатараў і кіраўнікоў, прапагандыстаў камуністычных ідэй.

І. В. Нямкевіч дэталёва прааналізаваў, як партыйны камітэт і партыйныя арганізацыі структурных падраздзяленняў ажыццяўляюць кіраўніцтва і аказваюць практычную дапамогу ў дзейнасці шматлікіх грамадскіх арганізацый вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся. Заўважана, што ў гэтай справе робіцца нямала. Як вынік, шырокае прызнанне заслужылі народны універсітэт маральна-эстэтычнага выхавання, камітэт ДТСААФ, значна палепшыў сваю работу факультэт грамадскіх прафесій. На ўзроўні патрабаванняў часу імкнуцца дзейнічаць народныя кантралёры, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі. Належным чынам ажыццяўляюць імі кіраўніцтва партыйныя арганізацыі матэматычнага і некаторых іншых факультэтаў. Разам з тым указана на сур'ёзныя прабелы ў гэтай справе з боку камуністаў біялагічнага факультэта. На працягу значнага часу яны крайне слаба цікавіліся работай грамадскіх арганізацый і не дамагаліся актывізацыі іх дзейнасці.

Дакладчык гаварыў аб формах і метадах паляпшэння партыйнага кіраўніцтва грамадскімі арганізацыямі, аб тым, што трэба зрабіць, каб выправіць недахопы там, дзе яны былі дапушчаны. Неабходна надаваць большую галоснасць дзейнасці грамадскіх арганізацый. У гэтых мэтах варта эфектыўней выкарыстоўваць шматтыражную газету «Гомельскі універсітэт» і насценны друк.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел дэкан факультэта грамадскіх прафесій А. І. Канашэвіч з кафедры палітэканоміі, сакратар камітэта камсамола ГДУ А. М. Кусянкоў, член партбюро матэматычнага факультэта С. Д. Бадруноў, старшыня прафкома М. Н. Мурашка, сакратар партбюро факультэта фізвыхавання Л. Н. Сечка, дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта Т. І. Язэпава, старшыня Клуба выхаднога дня, дацэнт кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны І. В. Хапалевіч, намеснік старшыні Савета кафедр грамадскіх навук, загадчык кафедры навуковага камунізму У. І. Качаткоў, прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў.

Як у дакладзе, так і ў выступленнях, былі выказаны канкрэтныя прапановы для далейшага паляпшэння партыйнага кіраўніцтва грамадскімі арганізацыямі, якія леглі ў аснову прынятай пастановы.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

# ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА

## ЛЕКЦЫЙ, ДАКЛАДАЎ, ГУТАРАК У СУВЯЗІ З ВЫБАРАМІ Ў ВЯРХОЎНЫ САВЕТ СССР

Выбары ў нашай краіне — пераканаўчае сведчанне сапраўднага народаўладдзя.

У. І. Ленін аб сацыялістычнай дэмакратыі.

Савецкае грамадства — грамадства рэальнай дэмакратыі.

Канстытуцыя СССР — увасабленне ленінскіх прынцыпаў народаўладдзя.

КПСС — кіруючая і накіроўваючая сіла савецкага грамадства.

Савецкая ўлада — улада народа і для народа.

СССР — агульнанародная сацыялістычная дзяржава.

Дзейнасць КПСС па далейшаму развіццю сацыялістычнай дэмакратыі.

Закон аб працоўных калектывах — новы крок у расшырэнні правоў працоўных.

Сацыялістычны ўклад жыцця — наша вялікая заваёва.

Рэальнасць правоў і свабод грамадзян СССР.

Раўнапраўе нацый і народнасцей у СССР.

Адзінства правоў і абавязкаў савецкага чалавека.

Няўхільнае выкананне савецкіх законаў — абавязак кожнага грамадзяніна СССР.

Праца — аснова магутнасці нашай Радзімы.

Павышэнне прадукцыйнасці працы — ключавая задача.

Эканомія і беражлівасць — справа кожнага, клопаты агульныя.

Узровень працоўнай дысцыпліны — паказчык ідэйнай і маральнай сталасці калектыву.

Новыя патрабаванні да арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва.

Таварам народнага спажывання — высокую якасць.

Размах жыллёвага будаўніцтва ў нашай краіне.

Клопаты дзяржавы аб здароўі савецкага чалавека.

Сістэма сацыяльнага забеспячэння ў СССР.

Вярхоўны Савет СССР — вышэйшы орган дзяржаўнай улады.

Саветы народных дэпутатаў — школа дзяржаўнага кіравання для шырокіх мас.

Роля Саветаў у камуністычным выхаванні працоўных.

Кандыдаты ў дэпутаты — сапраўдныя прадстаўнікі народа.

Дэмакратычны характар савецкай выбарчай сістэмы.

Закон аб выбарах у Вярхоўны Савет СССР.

Паўнамоцтвы і дзейнасць выбарчых камісій.

Блок камуністаў і беспартыйных — увасабленне непарушнага адзінства партыі і народа.

Наша краіна ў перыяд паміж выбарамі ў Вярхоўны Савет СССР.

Ад выбараў — да выбараў. (Аб зменах у эканамічным і сацыяльным жыцці калектыву, рэгіёна).

Наказы дэпутатам: як яны выконваюцца.

Роля прафсаюзаў у савецкім грамадстве.

Ленінскі камсамол — актыўны памочнік партыі.

Савецкія жанчыны — свабодныя і раўнапраўныя члены грамадства.

Вопыт ветэранаў партыі, вайны і працы — наша неацэннае багацце.

Патрыятызм і інтэрнацыяналізм савецкага народа.

Даступнасць і бясплатнасць адукацыі ў СССР.

Росквіт сацыялістычнай шматнацыянальнай культуры.

Ідэалагічная, масава-палітычная работа — справа ўсёй партыі, абавязак кожнага камуніста.

Масава-палітычная работа па месцы пражывання.

Перавага сацыялістычнай дэмакратыі над дэмакратыяй буржуазнай.

Фундаментальныя каштоўнасці сацыялізму.

Два светы — два ўклады жыцця.

Падаўленне правоў і свабод працоўных у свеце капіталу.

Масавае беспрацоўе ў капіталістычных краінах.

Антыдэмакратызм буржуазнай выбарчай сістэмы.

Антынародная сутнасць буржуазнай дэмакратыі.

Барацьба КПСС і Савецкай дзяржавы за захаванне міру, прадухіленне ядзернай катастрофы.

Заява таварыша Ю. У. Андропава ад 24 лістапада 1983 года — яркае выражэнне цвёрдай, рашучай і паслядоўнай міралюбівай палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы.

Адзінства і згуртаванасць краін сацыялістычнай садружнасці — важнейшы фактар у барацьбе за захаванне міру.

Імперыялізм ЗША — вораг міру, прагрэсу і свабоды.

Авантурыстычны, мілітарысцкі курс адміністрацыі ЗША — галоўная пагроза справе міру.

Умацаванне эканамічнай і абароннай магутнасці нашай краіны — патрыятычны і інтэрнацыянальны абавязак савецкіх людзей.

Савецкая Армія — надзейны вартавы мірнай працы савецкіх людзей.

1984 год — важны этап барацьбы за рэалізацыю рашэнняў XXVI з'езда КПСС, задач адзінаццатай пяцігодкі.

Задачы нашага калектыву ў чацвёртым годзе пяцігодкі.

Сустрэчны план нашага прадпрыемства.

Твой асабісты ўклад у пяцігодку.

Азнаменуем выбары ў Вярхоўны Савет СССР новымі дасягненнямі ў працы!

*Кубінскай рэвалюцыі — 25 гадоў*

# НА РЭЙКАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПЕРАБУДОВЫ

**(Працяг. Пачатак у № 39 за 1983 г.).**

Сацыялістычныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні прамысловасці і сельскай гаспадаркі, паспяховае развіццё эканомікі дазволілі рэвалюцыйнаму ўраду, Камуністычнай партыі Кубы ажыццявіць шырокую праграму павышэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўню кубінскіх працоўных. Сёння сацыялістычная Куба з'яўляецца яркім прыкладам рашэння сацыяльных праблем для іншых краін Лацінскай Амерыкі. Кубінская канстытуцыя гарантуе права на працу, адпачынак, сацыяльнае забеспячэнне, ахову здароўя, адукацыю. Яшчэ ў першыя гады рэвалюцыі было ліквідавана масавае беспрацоўе, ажыццёўлены прынцып роўнай аплаты за працу, што паклала канец расавай дыскрымінацыі і дыскрымінацыі жанчын, устаноўлены 8-гадзінны рабочы дзень і 44-гадзінны рабочы тыдзень.

Адна з вастрэйшых сацыяльных праблем рэвалюцыйнай Кубы — жыллёвы крызіс, які і сёння адчувае большасць лацінаамерыканскіх краін. Да рэвалюцыі больш паловы насельніцтва пражывала ў дамах, якія знаходзіліся ў дрэнным або аварыйным стане. Больш 47 працэнтаў жыллёвага фонду на Кубе было пабудавана пасля рэвалюцыі. Толькі з 1976 па 1980 г.г. было здадзена ў эксплуатацыю 83 тыс. кватэр, у якія ўсялілася 360 тыс. чалавек.

Сацыялістычная Куба маштабна рашае праблему ўрбанізацыі сяла, апярэджваючы ў гэтым плане нават рад сацыялістычных краін. За перыяд з 1959 па 1980 г. г. у сельскай мясцовасці было пабудавана 435 пасёлкаў гарадскога тыпу. У іх — чатырох-пяці паверховыя будынкі на 300—400 кватэр, мэбляваныя за кошт дзяржавы і маючыя ўсе гарадскія зручнасці.

Спецыфіка рашэння праблемы павышэння матэрыяльнага ўзроўню жыцця кубінскіх працоўных у тым, што доўгі час асноўны ўпор у гэтай галіне рабіўся на грамадскія фонды спажывання. У 1980 г. сярэднія даходы сям'і ад заработнай платы складалі 176 песа, а з даходамі ад грамадскіх фондаў спажывання яны дасягаюць 307 песа ў месяц. Важная роля належыць грамадскім фондам спажывання ў забеспячэнні кожнаму кубінцу гарантаваных мінімума спажывання прадуктаў харчавання і тавараў шырокага ўжытку. У сакавіку 1962 года ў краіне была ўведзена сістэма нарміраванага спажывання, існуючая да цяперашняга часу. Акрамя гэтага, існуе сістэма бясплатнага грамадскага харчавання ў школьных і студэнцкіх сталовых і для некаторых катэгорый працоўных. Разам з бясплатным і нарміраваным грамадскім спажываннем існуе сістэма свабоднага продажу прадуктовых і прамысловых тавараў звыш норм, устаноўленых картачнай сістэмай і па больш высокіх цэнах — так званы «паралельны рынак».

У ходзе сацыялістычнага будаўніцтва на Кубе адбыліся вялікія перамены ў сферы здароўя. Да рэвалюцыі па колькасці ўрачоў Куба займала 3-яе месца сярод краін Лацінскай Амерыкі. Аднак гэты паказчык не адлюстроўваў у поўнай меры сапраўднага стану аховы здароўя. Вялікая частка ўрачоў (3 тыс. з 5 тыс. меўшыхся ў краіне) была сканцэнтравана ў Гаване і займалася абслугоўваннем турыстаў і плацежаздольных пацыентаў.

Нізкі ўзровень медыцынскага абслугоўвання працоўных, практычна поўная адсутнасць прафілактыкі абумоўлівала шырокае распаўсюджванне інфекцыйных захворванняў: прыкладна 14 працэнтаў насельніцтва хварэла туберкулёзам, малярыяй. Дарэвалюцыйная Куба займала адно з першых месц у рэгіёне па дзіцячай смяротнасці. Працягласць жыцця кубінца складала толькі 53 гады.

У выніку сістэмы мер па развіццю народнай аховы здароўя сацыялістычная Куба ўжо ў сярэдзіне 70-х гадоў значна перавысіла ўсе лацінаамерыканскія краіны па ўзроўню медыцынскага абслугоўвання. За гады рэвалюцыі амаль у 4 разы павялічыўся састаў медыцынскага персаналу.

Вялікае значэнне для аховы здароўя насельніцтва мае тое, што разам з разгалінаванай сістэмай бясплатнага медыцынскага абслугоўвання (у год дзяржава затрачвае на гэтыя мэты ў разліку на 1 чалавека 55 песа) на Кубе створана за гады сацыялістычнага пераўтварэння сістэма масавай фізічнай культуры і спорту. Да рэвалюцыі на Кубе практычна не было магчымасці для заняткаў спортам. Невялікая колькасць спартыўных збудаванняў знаходзілася ў прыватных руках і служыла для заняткаў прафесіянальным спортам або для забаў багатых турыстаў. Пасля перамогі рэвалюцыі былі створаны неабходныя ўмовы для схілення да заняткаў фізічнай культурай і спортам шырокіх народных мас. Усе спартыўныя збудаванні былі перададзены ў бясплатнае карыстанне народу. Куба з'яўляецца ў цяперашні час адзінай краінай у свеце, дзе ўсе спартыўныя відовішчы, уключаючы нават міжнародныя спаборніцтвы, бясплатныя.

Клопат Кампартыі Кубы і народнага ўрада аб здароўі народа хутка даў істотныя вынікі. За кароткі тэрмін у тры разы панізілася дзіцячая смяротнасць, а працягласць жыцця кубінца дасягнула 73 гадоў. Па гэтаму важнаму паказчыку Куба выйшла ў лік найбольш развітых краін нашай планеты.

**А. КАНАШЭВІЧ,**
**кандыдат эканамічных навук.**

**Н. КАНАШЭВІЧ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

# ДЛЯ ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ—ТРЫВАЛЫ ФУНДАМЕНТ

## ПАЛАЖЭННЕ АБ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ СБА

Праца студэнтаў у летні перыяд з'яўляецца працягам вучэбна-выхаваўчага працэсу ў вышэйшай навучальнай установе. Студэнцкія атрады, якія арганізоўваюцца на прынцыпах добраахвотнасці, самакіравання і строгай дысцыпліны, выхоўваюць у студэнтаў пачуццё адказнасці за працу ў калектыве, вучаць падыходзіць да справы з дзяржаўных пазіцый.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж лінейнымі студэнцкімі атрадамі ўніверсітэта накіравана на паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ, дастойную сустрэчу 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

### I. МЭТЫ I ЗАДАЧЫ СПАБОРНІЦТВА

Сацыялістычнае спаборніцтва — важнейшы стымул вытворчай і вучэбнай дзейнасці студэнтаў. Мэта яго — павышаць якасць вучобы, грамадска-палітычную і працоўную актыўнасць юнакоў і дзяўчат.

**Задачы:**

— павышаць якасць вучобы студэнтаў, развіваць творчы падыход да вывучэння ўсіх дысцыплін;

— прыцягваць усіх студэнтаў да актыўнай дзейнасці ў грамадскім жыцці універсітэта;

— выхоўваць усіх студэнтаў на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа;

— ствараць у атрадзе дзелавую, творчую атмасферу ўзаемадапамогі, камсамольскай дысцыпліны і прынцыповасці;

— якасна фарміраваць студэнцкія атрады і праводзіць на высокім ідэйна-палітычным узроўні трэці працоўны семестр.

### II. ФОРМА ПРАВЯДЗЕННЯ I АРГАНІЗАЦЫЯ СПАБОРНІЦТВА

Сацыялістычнае спаборніцтва праводзіцца ў аглядзе-конкурсе на лепшую камсамольскую арганізацыю універсітэта і лепшы лінейны атрад па рабоце ў падрыхтоўчы і рабочы перыяд. Спаборніцтва праводзіцца паміж факультэтамі на званне «Лепшая камсамольская арганізацыя па падрыхтоўцы працоўнага семестра», а таксама паміж лінейнымі атрадамі на званне «Лепшы студэнцкі атрад».

### III. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ КАМСАМОЛЬСКІМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ ФАКУЛЬТЭТАЎ НА ЗВАННЕ «ЛЕПШАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕННЮ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА»

Падвядзенне вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва праводзіцца па факультэтах. Лепшай лічыцца камсамольская арганізацыя факультэта, якая набярэ меншую суму месц па напрамках работы, якая не мае выпадкаў парушэння Статута ВЛКСМ і правілаў тэхнікі бяспекі, а таксама праявіўшая высокую дысцыпліну і творчую ініцыятыву.

Вынікі падводзяцца ў два этапы: першы — падрыхтоўчы перыяд; другі — рабочы перыяд.

Па выніках падрыхтоўчага перыяду лепшая камсамольская арганізацыя ўзнагароджваецца Ганаровай граматай камітэта камсамола ГДУ.

Вынікі першага этапа падводзяцца ў маі 1983 года. Па выніках працоўнага семестра (падрыхтоўчы і рабочы перыяд) лепшай камсамольскай арганізацыі ўручаецца пераходны Чырвоны сцяг універсітэта, яна ўзнагароджваецца Ганаровай граматай рэктарата, парткома, камітэта ЛКСМБ і прафкома.

Вынікі другога этапа падводзяцца ў кастрычніку 1983 года.

#### ЯКАСНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ ПАДРЫХТОЎЧАГА ПЕРЫЯДУ

**Арганізацыйная работа**

1.1. Працэнт студэнтаў, якія прыцягваюцца да ўдзелу ў будаўнічых атрадах, да агульнай колькасці.

1.2. Працэнт байцоў, якія маюць спецыяльнасць будаўнікоў.

1.3. Сярэдні бал экзаменацыйных адзнак па курсу «Ахова працы ў студэнцкіх будаўнічых атрадах».

1.4. Захоўванне графікаў дагаворнай кампаніі, праходжанне медыцынскага агляду, навучанне па курсу «Ахова працы ў СБА», падача дакументацыі ў штаб працоўных спраў і г. д. (па прадстаўленню штаба працоўных спраў універсітэта).

1.5. Сярэдні бал экзаменацыйных адзнак, атрыманых камандзірамі і камісарамі пры атэстацыі.

**Ідэйна-выхаваўчая работа.**

1.1. Працэнт грамадска-палітычнага актыву студэнцкіх атрадаў, якія прайшоў абучэнне, ад агульнай колькасці байцоў.

2.2. Сярэдні працэнт выканання атрадамі сацыялістычных абавязацельстваў за падрыхтоўчы перыяд па грамадска-палітычнай рабоце.

2.3. Сума месц, занятых у аглядах-конкурсах, якія праводзіліся штабам працоўных спраў універсітэта.

2.4. Наяўнасць новых форм работы.

#### РАБОЧЫ ПЕРЫЯД

**Арганізацыйная работа.**

1.1. Працэнт прыцягнення студэнтаў у ЛСБА.

1.2. Працэнт выканання плана фарміравання.

1.3. Сярэдняя выпрацоўка на аднаго байца СБА.

1.4. Сярэдняя заработная плата на аднаго байца.

а) для будаўнічых атрадаў;
б) для небудаўнічых атрадаў

**ІДЭЙНА-ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА**

2.1. Узровень грамадска-палітычнай работы.

2.2. Пералічэнні за дні ўдарнай працы.

### IV. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА СЯРОД СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ НА ЗВАННЕ «ЛЕПШЫ СТУДЭНЦКІ АТРАД»

Лепшым студэнцкім атрадам універсітэта лічыцца атрад, які мае найвышэйшы працэнт выканання сацыялістычных абавязацельстваў на падрыхтоўчы і рабочы перыяд, які паказаў высокую дысцыпліну і творчую ініцыятыву, не мае парушэнняў Статута Усесаюзнага студэнцкага будаўнічага атрада і правілаў тэхнікі бяспекі.

Вынікі падводзяцца ў два этапы; першы — падрыхтоўчы перыяд, другі — рабочы перыяд.

Па выніках падрыхтоўчага перыяду лепшы студэнцкі атрад універсітэта ўзнагароджваецца Ганаровай граматай камітэта камсамола універсітэта. Студэнцкія атрады, якія зоймуць другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца граматамі камітэта камсамола універсітэта. Вынікі першага этапа падводзяцца ў маі 1983 года.

Па выніках працоўнага семестра (падрыхтоўчы і рабочы перыяды) тром лепшым студэнцкім атрадам ГДУ па напрамках работы (будаўніцтва, меліярацыі, СА небудаўнічага профілю) уручаецца пераходны Чырвоны вымпел камітэта камсамола універсітэта, атрад узнагароджваецца Ганаровай граматай рэктарата, парткома, камітэта ЛКСМБ і прафкома. Фотакарткі атрадаў для Сцяга універсітэта змяшчаюцца ў альбоме працоўнай славы камітэта камсамола універсітэта. Студэнцкія атрады, якія занялі другія і трэція месцы ў сацыялістычным спаборніцтве, узнагароджваюцца граматамі рэктарата, парткома, камітэта ЛКСМБ і прафкома.

Студэнцкія атрады, якія прызнаны пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва па напрамках работы:

— вытворчая дзейнасць;

— грамадска-палітычная работа;

— ваенна-патрыятычная работа;

— дапамога сельскай школе, узнагароджваюцца граматамі камітэта камсамола ГДУ.

Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва падводзяцца штабам працоўных спраў і зацвярджаюцца камітэтам камсамола універсітэта.

## САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

### ЗВОДНАГА СТУДЭНЦКАГА АТРАДА ГДУ НА ПАДРЫХТОЎЧЫ ПЕРЫЯД

**У выкананні рашэнняў XXVI з'езда КПСС актыўны ўдзел прымае студэнцкая моладзь Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Ударнай працай, высокай грамадска-палітычнай актыўнасцю адзначыў зводны студэнцкі атрад ГДУ свой 22-гі працоўны семестр. Больш 1000 камсамольцаў у розных галінах народнай гаспадаркі вобласці і за яе межамі выканалі аб'ём работ на суму 769,5 тыс. рублёў, правялі на месцах дыслакацыі вялікую агітацыйна-прапагандысцкую работу.**

**Кіруючыся рашэннямі XXVI з'езда КПСС, майскага (1982 г.), лістападаўскага (1982 г.), чэрвеньскага (1983 г.), снежаньскага (1983 г.) Пленумаў КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ, актыўна ўключыўшыся ў патрыятычны рух камсамольцаў і моладзі «XI пяцігодцы — ўдарную працу, веды, ініцыятыву і творчасць маладых!», удзельнікі трэцяга працоўнага семестра 1984 года бяруць наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:**

**1. Сацыялістычнае спаборніцтва ў трэцім працоўным семестры 1984 года правесці пад дэвізам: «40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — дастойную сустрэчу!».**

**2. Сфарміраваць зводны студэнцкі атрад ГДУ колькасцю 950 байцоў.**

**3. Падрыхтаваць па 3—5 лектараў на кожны атрад. Прарэцэнзаваць 100 прац. тэкстаў лекцый.**

**4. Падрыхтаваць па 49 — дружын па ахове прыроды, дружыннікаў-выратавальнікаў, адказных за кансультацыйны пункт, адказных за ваенна-патрыятычную работу, адказных за спартыўную работу, адказных за работу па аказанню дапамогі сельскай школе, рэдактараў насценгазет, кіраўнікоў агітбрыгад, старшынь рэўкамісій.**

**5. Якасна правесці вучобу па тэхніцы бяспекі. Дабіцца 75 прац. адзнак «выдатна», 25 прац. — «добра».**

**6. Прарэцэнзаваць 100 прац. сцэнарыяў агітбрыгад. Павысіць іх змест і тэматычную накіраванасць.**

**7. Прыняць удзел у абласным «Тыдні студэнцкіх атрадаў» і заняць адно з прызавых месц.**

**8. Якасна правесці вучобу кіраўнікоў атрадаў, усяго актыву студэнцкіх атрадаў.**

**9. Падрыхтаваць 75 прац. членаў атрадаў па будаўнічых спецыяльнасцях.**

**10. Своечасова і якасна правесці дагаворную кампанію.**

**11. Своечасова і якасна правесці медыцынскі агляд удзельнікаў працоўнага семестра.**

**12. На кожным факультэце аформіць стэнд, прысвечаны дзейнасці СБА.**

**13. Рэгулярна змяшчаць матэрыялы ў газеце «Гомельскі універсітэт» аб фарміраванні і падрыхтоўцы студэнцкіх атрадаў да працоўнага семестра.**

**14. Выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшаму правядзенню працоўнага семестра-84 камсамольскую арганізацыю БІІЧТу.**



# З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, НОВЫ ЛІТАРАТУРНЫ КЛУБ!

Сапраўдным святам стала адкрыццё напярэдадні Новага года ў студэнцкім кафэ літаратурнага клуба гісторыка—філалагічнага факультэта.

Ва ўтульнай і прыгожай зале кафэ сабраліся студэнты гістфіла — аматары паэзіі, літаратуры. Яны запрасілі да сябе ў госці дэкана гістфіла Т. І. Язэпаву, намесніка сакратара партбюро факультэта па ідэалагічнай рабоце, дацэнта кафедры рускай літаратуры А. К. Няронскую, рэктара народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання дацэнта Т. П Гараніну, членаў рэспубліканскай арганізацыі таварыства «Веды», студэнтаў іншых факультэтаў.

Да адкрыцця літаратурнага клуба будучыя філолагі падрыхтавалі літаратурна-музычную кампазіцыю па творчасці Расула Гамзатава «Гары, маё сэрца». Вельмі лірычна, пранікнёна вялі расказ аб жыцці творчасці Р. Гамзатава вядучыя Л. Галькіна, А. Казлоў, Н. Шчарбіна. Разам з імі вершы дагестанскага паэта чыталі студэнткі І. Чарнаус, Н. Грышчанка, І. Фёдарава, Л. Плыгаўка.

Творчасць Гамзатава нельга ўявіць без музыкі. Таму так многа гучала на вечары песень, якія выконвалі Т. Даўгун, І. Даўгун, І. Башкінцаў.

У зале панавала цёплая таварыская атмасфера. У адрас гаспадароў вечара былі сказаны добрыя пажаданні. З днём нараджэння павіншавалі літаратурны клуб гісторыка-філалагічнага факультэта члены літаратурнага клуба матэматычнага факультэта «Градыент», якія з'яўляюцца першаадкрывальнікамі літаратурных клубаў у ГДУ.

Доўга гучалі на вечары песні, рамансы пад акампанемент гітары.

Ад імя народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання членам Савета студэнцкага кафэ былі ўручаны значкі «40 год вызвалення .г Гомеля».

Шчаслівай творчай дейнасці, новы літаратурны клуб!

**Н. КАПШАЙ,**
**загадчыца сектара ідэйна-выхаваўчай работы бібліятэкі ГДУ.**



**НА ЗДЫМКУ: на адкрыцці літаратурнага клуба выступае рэктар народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання дацэнт Т. П. Гараніна.**
Фота С. Коваля.

